# Новыя перспектывы даследаванняў гісторыі роду Сабескіх

у межах навуковага супрацоўніцтва паміж Музеем Палаца Караля Яна III у Вілянуве і Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі ў Мінску.

**Muzeum Pałacu Króla Jana III w Wilanowie**
*Museum of King Jan III's Palace at Wilanów*
ul. Stanisława Kostki Potockiego 10/16, 02-958 Warszawa
tel.: (+48) 22 544 27 00
e-mail: muzeum@muzeum-wilanow.pl
www.wilanow-palac.pl

**Rezerwacje biletów dla grup:** / *Group tickets reservation:*
tel.: (+48) 22 54 42 850 (pon.–pt., godz. 9–16 / *Mon.–Fri., 9 a.m.–4 p.m.*)
e-mail: bilety@muzeum-wilanow.pl / *tickets@muzeum-wilanow.pl*



Ministerstwo Kultury i Dziedzictwa Narodowego.

Прафінансавана коштам Міністэрства Культуры і Нацыянальнай Спадчыны

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

tłumaczenie na język białoruski:
Dzianis Liseichykau

Музей Караля Яна III у Вілянуве шмат гадоў праводзіць навуковыя і навукова-папулярныя даследаванні, сканцэнтраваныя вакол роду Сабескіх. Асноўнай ідэяй шматлікіх праектаў з'яўляецца пошук тэм і шляхоў, якія дазволілі б больш поўна прадставіць гісторыю жыцця і дасягненняў караля Яна III – аднаго з найвыдатнейшых уладароў колішняй Рэчы Паспалітай, а таксама яго сям'і. Супрацоўніцтва паміж Музеем і Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі ў Мінску, распачатае ўвесну 2015 года, адчыняе абсалютна новыя перспектывы для даследаванняў.



Фрагмент рукапісу Марыі Казіміры Сабескай, са збораў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску



Марыя Казіміра з дачкой Тэрэзай Кунегундай, Ежы Элеўтэр Шымановіч-Семігіноўскі, каля 1690, Музей Палаца Караля Яна III у Вілянуве

У фондах мінскага архіва сярод іншага знаходзяцца два неацэнныя фонды дакументаў – Архіў Сабескіх з Алавы (фонд 695) і велізарны фрагмент Архіва Радзівілаў з Нясвіжа (фонд 694), у склад якога ўвайшоў архіў Сабескіх з Жоўквы. Алаўскі архіў доўгі час лічыўся незваротна страчаным у часе бітвы за Берлін у 1945 годзе. Між тым аказалася, што пасля ўзяцця сталіцы Трэцяга Рэйха Чырвонай Арміяй гэты архіў першапачаткова трапіў у Маскву, а пасля ў Мінск. Некалькі гадоў таму стала магчымым прадставіць яго шырокаму колу грамадскасці. Неўзабаве архівісты з Мінска старанна апрацавалі матэрыялы фонда, які пачаў фігураваць пад сігнатурай «фонд 695». Ужо першыя пробныя даследаванні пацвердзілі вялікую каштоўнасць дакументаў. Сярод іншага знайшлася перапіска Марыі-Казіміры з Янам Сабескім, якая лічылася страчанай, данясенні дыпламатаў і агентаў Яна III з розных еўрапейскіх сталіц, а таксама сямейная перапіска Марыі-Казіміры, складзеная ўжо пасля смерці караля. Менавіта гэтая перапіска каралевы зрабілася першым полем для сумесных навуковых дзеянняў Музея і Архіва. Падтрымка Міністэрства Культуры і Нацыянальнай Спадчыны зрабіла магчымым пачаць працу над апісаннем, перакладам, а таксама апрацоўкай крыніц з мэтай іх далейшага выдання.



Ян III у коле сям'і, прыдворны мастак, пасля 1693, Музей Палаца Караля Яна III у Вілянуве



Ян III з сынам Якубам Людвікам, Ежы Элеўтэр Шымановіч-Семігіноўскі, каля 1690, Музей Палаца Караля Яна III у Вілянуве



Якуб Людвік Сабескі, сілезскі мастак, пасля 1691, Музей Палаца Караля Яна III у Вілянуве



Тэрэза Кунегунда Сабеская, французскі мастак, мяжа XVII/XVIII стагоддзяў, Музей Палаца Караля Яна III у Вілянуве



Якуб Людвік Сабескі, французскі мастак, які працаваў у Польшчы, каля 1685, Музей Палаца Караля Яна III у Вілянуве



Фрагмент рукапісу Марыі Казіміры Сабескай, са збораў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску

Супрацоўніцтва Музея Палаца Караля Яна III у Вілянуве з Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі ў Мінску з'яўляецца важным раздзелам у сферы двухбаковых беларуска-польскіх навуковых праектаў. Яго мэтай з'яўляецца аблягчэнне доступу і распаўсюджванне ведаў аб малавядомых альбо зусім невядомых архіўных крыніцах, якія тычацца каралеўскага роду Сабескіх, і ўяўляюць надзвычай каштоўную супольную спадчыну народаў колішняй Рэчы Паспалітай. Рэалізацыя гэтага праекта была б немагчымай без прыязнага і адкрытага стаўлення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, а таксама шырокай, не толькі фінансавай, падтрымкі Міністэрства Культуры і Нацыянальнай Спадчыны.